***Ганна Барвенава***

## НЕБЯСПЕКА ЗМЕНЫ СУТНАСЦІ: ВІЗУАЛЬНЫЯ СІМВАЛЫ ТРАДЫЦЫЙНЫХ СВЯТ

З 1991г., часу аднаўлення незалежнасці Беларусі, у тэорыі і практыцы рэжысуры масавых імпрэз значна ўзмацніўся напрамак на адраджэнне менвіта традыцыйнай святочнай культуры. Створаныя ў савецкі перыяд святы сталі забывацца, альбо былі адменены; затое імгненна пачалі святкавацца раней паўзабытыя народныя святы і абрады (некаторыя нават сталі дзяржаўнымі). Зараз аднаўляюцца гарадскія, рэлігійныя святы, ствараюцца новыя святы, якія падкрэсліваюць самакаштоўнасць беларускай культуры. Святочная культура Беларусі апошняга дваццацігоддзя з'яўляецца выразнай праявай адраджэння генетычнай памяці, абапіраецца на святочную культуру нашых продкаў. Адначасова адбывалася разуменне ўплыву свята на грамадства, адпаведна святочны каляндар актыўна дапасоўваўся пад дамінантную дзяржаўную ідэалогію.

Традыцыйныя беларускія народныя святы, якія прыняты народным календаром — «Каляды» (25 снежня), «Гуканне вясны», «Пакровы», «Вялікдзень», «Радаўніца», «Сёмуха», «Купалле» (24 чэрвеня), «Мядовы спас», «Дажынкі», «Багач», «Дзяды» і інш. — адлюстроўваюць адвечныя погляды чалавека на сусвет, а таксама працэсы ўніфікацыі гэтых поглядаў, іх дыферэнцыяцыі, культурныя ўплывы ў тым ліку хрысціянізацыі і інш. [1; 2]. У многіх краінах, у тым ліку бліжэйшых суседзяў, пасля аднаўлення незалежнасці традыцыйныя святы, народнае мастацтва, сярод іншага, сталі падмуркам вызначэння, асэнсавання і канструявання нацыянальнай ідэнтычнасці, доказам унікальнасці ў сусветнай культуры. Па такім шляху беларускія святы пайшлі толькі ў канцы XX ст. [3], за апошнія гады па многіх прычынах назіраецца адыход гледачоў і нават удзельнікаў (найперш ў вялікіх населеных пунктах) ад свят каляндарнага кола. Ніводнае традыцыйнае свята, народная песня, гульня не сталі асацыявацца з Беларуссю па-за межамі краіны, увасабляць яе багатую культуру. Чаму? На жаль, за апошнія гады дапушчаны адна памылка за другой у часе правядзення свята, у рэжысуры, візуальным вобразе, персанажах, сімвалах, падборы рэпертуару. Святы каляндарнага кола падобны адно да другога, у першую чаргу ў гарадах (кірмаш, канцэрт, салют). Коратка закранем толькі некаторыя памылкі святкаванняў «Масленіцы».

Не адпаведна традыцыі і не асэнсавана прынятыя назва і час свята. Назва свята «Масленіца» памылковая, таму што: 1) вузка рэгіянальная (Усходняе Палессе *Масленка, Маслаед, Ма́сны тыждэнь,* іншыя рэгіёны Беларусі *Каляда масленая, Каровіна і конскае свята, Калодзій* і інш.); 2) абмежаваная па часе (адзін тыдзень); 3) не існавала ў палацавай, гарадской і мястэчковай культуры, не сустракаецца ў пісьмовых помніках XVI–XVIII стст. У мастацкай літаратуры, гаспадарчых дакументах XVI–XVIII стст. гэтае свята называцца ***Запусты***, ***Мясапуст***, ***maskary***.

Запусты або Мясапуст рабіліся эпілогам святкаванняў ад Божага нараджэння і прадмовай да Вялікадня. Старабеларускія аўтары сцвярджалі, што можна «шалець» ад св. Сільвестра (напярэдадні Новага году), адразу пасля Новага году, альбо ад свята Трох каралёў, Божага нараджэння па грэка-хрысціянскаму календару (6 студзеня) да пачатку Вялікага посту (да попельнай серады). «Запусты» — так называўся святочны перыяд цалкам, «Мясапуст» — кульмінацыя свята, апошні святочны тыдзень перад постам [4]. Пачатак зімовых гулянняў кожны год змяняецца ў залежнасці ад таго, калі пачынаецца Вялікі пост, які доўжыцца 40 дзён і завяршаецца Вялікаднем. Адпаведна, час свята на Беларусі трэба прымяркоўваць згодна нашай унікальнасці — суіснавання каталіцкай, праваслаўнай, грэка-каталіцкай (уніяцкай), пратэстанцкай канфесій. Кульмінацыя свята, <u>святочны тыдзень</u> гулянняў павінен прыпадаць на <u>час паралельнага посту</u>. Названы перыяд з'яўляецца святочным па ўсёй Еўропе: назва «Мясапуст» дублюецца ў чэскай мове *masapust*; польская — *Zapusty, zabawa karnawałowa, bal karnawałowy; Vastlāvji, Meteni* — латышы; *Užgavėnės* — літоўцы; *Vastlapäev* — эстонцы; *Fastnacht* — немцы; *Fastelavn* — нарвежцы; *Sächsilüüte* — у Швейцарыі, *Масленица*, *Сырная седмица* — рускія, *Smrtni nedel'a* — славакі і г. д. Назва «Мясапуст» не супярэчыць традыцыйнай беларускай культуры, дзе восьмы тыдзень перад Вялікаднем зваўся *мясапусным* [1; 5].

Асноўныя формы святкавання Мясапусту названы ў старабеларускіх пісьмовых помніках: маскарады, пераапрананні (maskary), маскарадныя гулянні, карнавалы (maszkary woźby), катанне на санках (wozenie na sankach), камедыйныя маскарадныя прадстаўленні на гарадскіх плошчах (komedia maszkarna), гульні, лёгкія пацехі (igryski pospolity, uciehi lekki), схаваныя за маскамі жарты над свецкімі і рэлігійнымі асобамі [6]. На Мясапуст да стала падаваліся пераважна мясныя стравы, у тым ліку — з аленя, зубра, як напісана ў вершаваным зборніку пач. XVII ст «Kiermaszu wieśniackim»: «Mięsopusty, zapusty, | Nie chcą państwo kapusty, | Wolą sarny, jelenie | I żubrowe pieczenie».

У сталічных і буйных гарадах Польшчы і ВКЛ (Варшава, Кракаў, Вільня, Гародня, Магілёў, Нясвіж і інш.) маскарады пераходзілі ў памяшканне, тады госці задарма маглі карыстацца толькі музыкай і асвятленнем, за астатняе трэба было плаціць. Публічныя балі-маскарады ці інакш «Рэдуты» (ад італ. ridotto — баль-маскарад) адбываліся на працягу Мясапусту тры, чатыры, нават пяць разоў на тыдзень. На іх глядзелі прадстаўленні, танцавалі, жартавалі, пераапраналіся «maszkar, ubiorów ku diabłu podobnych sobie nie wymyśli», гулялі ў косці, карты, частаваліся. Мадэрнізаваны аналаг прынятых у Вялікім Княстве Літоўскім маскарадаў, карнавалаў, баляў можам штогод назіраць у многіх гарадах Еўропы, дзе традыцыі свят не перапыняліся.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У адрозненні ад маскарадаў, у якіх маглі ўзяць удзел людзі кожнай сацыяльнай групы, ***Кулігі*** — звычай адведзін суседзяў па ваколіцы — былі забавай шляхты. Назву звязваюць з назвай птушкі кулік, нібыта менавіта яго шукалі па вакольных дварах гучнай грамадой з вершнікамі і санямі [7]. Да Куліг рыхтаваліся, таму гістарычныя дакументы сведчаць, што для двара Мікалая Крыштафа Радзівіла замаўлялі «крылы Купідона, лукі, жазло для блазна, вусы, ківоры, вянцы, шапкі з кветкамі, стракатае адзенне ў тым ліку для музыкаў, курцікаў (карлікаў), плюмажы, шаблі, званочкі на маскі, драўляныя пацеркі, яблыкі-шары, якія павінны былі насіць у руцэ, кашы» і інш. [7]. Арганізоўвалі сані, вазніцаў, паходні, як пісаў ананімны паэт у 1566 г. «Zaprzężmy w sanki, włóżmy chomąt z drogi | Na tego konia choć brudnosiwego, | A nawieszajmy cymbałów u niego. | Sami kosztowne szaty na się wdziejmy | … U tych-tu sąsiad ze trzy dni zamieszkajmy, | A czwartego zaś indziej się udamy». Прадумвалі парадак адведзін, гаспадары павінны былі падрыхтаваць дом да прыезду Куліг з начлегам, забяспечыць пачастунак. Удзельнікі Куліг сустракаліся на санях у вызначаным месцы, калі гэта адбывалася ў горадзе, то на плошчы іх віталі музыкі і гараджане. Калі ўсё было падрыхтавана, адсылалі па дамах жазло з шарам (асацыяцыя з дзяржаўным яблыкам і жазлом), як сімвал склікання Куліг. У дарогу выпраўлялі блазна ці асобу пераапранутую арлекінам. Уваходзячы на ганак дома, у які збіраліся заехаць, блазен спяваў: «Ej, kulig, kulig, kulig!», астатнія ўдзельнікі ў суправаджэнні музыкаў, паходняў улятали у двор, крычалі вітанні, заздаровіцы. Гаспадар з гаспадыняю сустракалі кулігоўшчыкаў і запрашалі да пакояў, да стала, да гульняў, танцаў. Несумненна, гэта былі варыяцыі на тэму калядоўшчыкаў, валачобнікаў, але ў свецкай афарбоўцы і для заможных.

Мясапуст — пераважна гарадская, шляхецкая святочная традыцыя. У беларускай вёсцы, як канстатуе У. Васілевіч: «святкаванні на Масленічным тыдні ... праводзіліся больш сціпла, чым у Расіі, але і ў нас сустракаліся цікавыя забавы. І дзятва, і моладзь коўзаліся з горак на санках, на высечаных на рацэ кавалках ільду. Чым даўжэй скоцішся — тым, думалася, даўжэй будуць летам лён і пянька. Дзеля гэтага нават спецыяльна насыпалі высокія горкі са снегу. У некаторых мясцовасцях сустракаўся звычай сярод маладых хлопцаў вазіць на Масленіцу павівальных бабак. Пэўна, такім чынам імкнуліся забяспечыць паспяховы працяг свайго роду ў будучым». Пра гэта гаворыць і даволі абмежаваная колькасць масленічных песняў. Адпаведна, падмуркам, натхняльнікам сучаснага гарадскога свята Мясапусту павінны стаць багатыя гарадскія і магнацкія традыцыі нашых продкаў, з далучэннем народных традыцый вясновых свят (арэлі, калодка і інш.).

Нарэшце, адкуль у апошнія часы на беларускім святе з'явіліся запазычаныя бліны? Так, сапраўды, «главные традиционные атрибуты народного празднования Масленицы в России — блины и гулянья», але па апісаннях паважаных беларускіх фалькларыстаў А. Багдановіча, У. Васілевіча і многіх інш. бліны ў традыцыйнай культуры былі атрыбутам рытуальнай памінальнай вячэры. «Радоуница или «небожчицкий великий день» ... отличается оть других дзедовь тъмъ, что въ этотъ день ... хозяйки обязательно *пекут «грибки», т. е. толстые блины изъ пшеничной муки, на масле и яйцах; ... несут на кладбище*» [5]. «На дзевятым перадвялікодным тыдні, у суботу, напярэдадні мясапуснага тыдня, калі, згодна з праваслаўным календаром, адбываюцца памінкі па ўсіх памёршых продках, на Беларусі адзначалі Масленыя (зімовыя, Стрэчаньскія) Дзяды. Як і ва ўсе іншыя сезонныя Дзяды (на Радаўніцу, напярэдадні Сёмухі, увосень перад Змітравым днём), на Масленыя за памінальнай вячэрай збіралася ўся сям'я. ... На стол у шклянку з зернем ставілася запаленая свечка, ... гарэлка. Пасля малітвы пачыналася «дзядоўская вячэра», на працягу якой стараліся весці сумныя размовы, успамінаць блізкіх і далёкіх родзічаў, што пакінулі гэты свет» [1]. На традыцыйным вяселлі, пры любой святочнай сітуацыі беларус ніколі не падаваў і не падае бліны — абсмяюць. Кожная гаспадыня ведае, што пустыя, без начынкі бліны робяцца толькі тады, калі больш у доме нічога ад бядноты няма, аладкі з мукі і вады на алеі — страва падчас посту. Ні ў адным дакуменце XVI–XIX стст. не апісана, каб падчас святаў на Беларусі выпякалі бліны, за імі лазілі на слуп, потым елі іх з ласасёвай ікрой, прадавалі і даравалі адно аднаму. Адпаведна, такой традыцыі ніколі не існавала. Для традыцыйнай беларускай кухні характэрны пышныя бліны што заквашвалі на апары, яны падыходзілі, пасля выпякання іх падавалі з кілбасамі, мачанкай; тонкія бліны (як рускія) не выпякаліся.

Адмаўляюць нетрадыцыйную, новастворанаую сімволіку «блина-солнца» і рускія даследчыкі. На іх думку, з падачы вучоных «міфалагічнай школы» (А.М. Афанасьеў і інш.) у канцы XIX ст. блін у масавай свядомасці пачынае асацыявацца з сонцам. Прычынай гэтага стала некарэктнасць навуковых метадаў гэтай школы, якая звязвала ўсе міфы і рытуалы з нябёснымі з'явамі. На самай справе блін ў славян ніколі не быў атрыбутам культу сонца. Тым не менш, міфалагема пра сувязь з сонцам стала вельмі папулярнай, і адбілася ў выявах, на святах. Усходняя традыцыя круглага хлеба (лаваш і інш.) мае ўласную семантыку і сімволіку, якая не перакрыжоўваецца з еўрапейскімі ў тым ліку беларускімі традыцыямі.

Сучасная святы Беларусі, на вялікі жаль, нярэдка абапіраюцца на распрацаваныя ў 1960–1970 гады «ўніфікаваныя для ўсходнеславянскай тэрыторыі» схемы, або на сучасныя сцэнары, прапанаваныя на замежных інтэрнэт-сайтах. Такія святы не маюць рэгіянальных адметнасцяў, не грунтуюцца на даследаваннях беларускіх фалькларыстаў, гісторыкаў, мастацтвазнаўцаў, ладзяцца на аснове адвольна запазычаных небеларускіх святочных дзеянняў або сімвалаў, і, галоўнае, не выконваюць вялікую мэту свята — эстэтычны адпачынак удзельнікаў і гледачоў. Святочная культура Беларусі мае велізарны патэнцыял для развіцця нацыі, культурнага турызму, але толькі ў выпадку звароту да адвечных уласна беларускіх традыцый і адукаванай, пісьменнай іх эстэтычнай інтэрпрэтацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Спіс літаратуры:**


1. Васілевіч, У. Беларускі народны каляндар / У. Васілевич // Паэзія беларускага земляробчага календара / склад. А.С. Ліс. – Мінск : Выш. школа, 1992. – С. 554–612.
2. Санько, С. Каляндарныя аспекты рэканструкцыі старажытных светаглядных сістэм / С. Санько // KRYUJA // [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://kryuja.org/artykuly/sanko/kaliandarnyja_aspekty_rekanstrukcyji_starazhytnych_svietahliadnych_system.html. – Дата доступа: 15.04 2012.
3. Сцэнар Масленіцы // [Электронны рэсурс]. – Режим доступа: http://dzietki.org/article/cms_view_article.php?aid=138. – Дата доступа: 15.04 2012.
4. Obyczaje w Polsce w sredniowieczy i Nowym czasie / Praca zborowa. – Krakow, 2008. – S. 175.
5. Богданович, А.Е. Пережитки древняго міросозерцанія у бълоруссовъ. Этнографический очеркъ / А.Е. Богданович. – Гродна : Губернская Типографія, 1895. – 186 с.
6. Бохан, Ю.М. Побыт феадалаў Вялікага Княства Літоўскага ў XV – сярэдзіне XVII стагоддзя / Ю.М. Бохан, А.А. Скеп'ян – Мінск : Беларусь, 2011. – 200–250.
7. Kempa, T. Mikolaj Krzysztof Radziwill Sierotka (1549–1616) wojewoda wilenski/ – Warszawa, 2002. – S 45, 63
8. Русские блины / Википедия // [Электронны рэсурс]. – Режим доступа: http://ru.wikipedia.org. – Дата доступа: 15.04 2012.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ